# Святкуем Багач: фальклоране свята для вучняў 3 класа

**І. В. Ларыёнава,**
настаўнік пачатковых класаў другой катэгорыі
Пінкавіцкай СШ імя Якуба Коласа Пінскага раёна

**Мэта:** вывучэнне і прапаганда духоўнай спадчыны, абрадаў і традыцый беларукага народа.

**Задачы:** пашыраць веды вучняў пра беларускія нацыянальныя традыцыі; пазнаёміць з асаблівасцямі святкавання свята Багач; развіваць творчыя здольнасці, ініцыятыву дзяцей; выхоўваць паважлівыя адносіны да сваёй спадчыны; развіваць у малодшых школьнікаў навыкі самастойнага вывучэння беларускіх нацыянальных традыцый.

## ХОД МЕРАРЫЕМСТВА

*Зала прыбрана пад вясковую хату. Развешаны саматканыя ручнікі, дываны. Уваходзяць па-святочнаму апранутая гаспадыня з вышытым настольнікам, якім засцілае стол.*

**Вядучы.** Шаноўныя госці! Сёння мы запрасілі вас на Багач. Багач – гэта свята заканчэння ўборкі збожжавых і пачатак азімай сяўбы. У мінулым людзі адзначалі яго тады, калі апошні сноп быў дажаты. Сноп урачыста прыносілі ў хату, абмалочвалі, зерне ссыпалі ў лубку. Затым устаўлялі свечку і запальвалі яе. Такім чынам рабіўся «багач», які заносілі ў кожны двор з пажаданням багацця. «Багач», згодна з павер’ем, забяспечваў ніву жытам і прыносіў у хату дастатак і шчасце. «Прышоў Багач – кідай рагач, бяры сявеньку – сей памаленьку!».

А зараз я вам прапаную паглядзець, як адзначалі свята Багач нашыя продкі.

*Уваходзяць гаспадыня па-святочнаму апранутая з вышытым настольнікам, якім засцілае стол.*

**Гаспадыня** *(гучна).*Васіль, прынясі мне тыя кветкі, што ў збане стаяць.

*Уваходзіць гаспадар з букетам.*

**Гаспадар.** Можа, ніхто не прыйдзе, а ты ўсё увіхаешся.

**Гаспадыня.** *(Ставячы на стол букет.)* Прыйдуць, абавязкова прыйдуць, ідзі, Васілька апраніся па святочнаму. Сёння ж Багач, а я тым часам накрыю стол.

**Гаспадар.** Ды іду ужо, Мар'ечка, іду. *(Выходзіць.)*

*Гаспадыня выносіць і ставіць на стол розныя стравы. За сцэнай чуюцца песні, музыка.*

**Гаспадыня.** Васіль, дзе ты падзеўся? Ужо госці ідуць, Багач нясуць.

*Заходзіць гаспадар. Гучыць вясёлая музыка. Малады хлопец нясе плеценую лубку з жытам і свечкай пасярэдзіне. За ім ідуць госці.*

**Госць 1.** *(Сеючы зерне.)* Ідзе Багач багаты – адчыняй дзверы, хто яму рады.

**Гаспадар.** *(Адчыняе дзверы.)* Вельмі рад я Багачу. Дзверы адчыніць хачу.

**Госць 2.** Ідзе Багач чыстымі нівамі, вязе багаты ураджай вазамі.

**Госць 3.** Прыйшоў багач – кідай рагач.

**Госць 4.** Бяры сявеньку ды сей памаленьку.

**Госць 5.** Багача на пачэсны кут адпраўляем. *(Госць 1ставіць сявеньку на покуць.)*

**Госць 2.** *(З паклонам.)* А вам шчасця, здароўя жадаем, дастатку жадаем!

**Госць 1.** Дык няхай жа вам будзе чыста ў полі!

**Госць 4.** Багата ў хаце!

**Госць 5.** Даўгалецця і згоды!

**Госць 3.** Век гора не знаці!

**Гаспадар.** *(З паклонам.)* Дзякуй, дзякуй, што хату не абышлі!

**Гаспадыня.** *(З паклонам.)* Добрыя словы для нас знайшлі!

**Госць 1.** А ці можна ў вас дазволу папытаць, каб у гэтай добрай хаце «Лявоніху» паскакаць?

**Гаспадары.** Калі ласка, паскачыце, нас, старых, павесяліце. *(Усе танцуюць «Лявоніху».)*

**Госць 5.** Павясяліліся і досыць! Але, дзеўкі, трэба ўжо несці Багача да іншых двароў.

**Гаспадыня.** Мае ж вы дзетачкі, дочачкі, сыночкі, вялікі дзякуй, што вы ўсе сюды прыйшлі. Дай Бог вам долі, мае каласочкі, каб ўсё жыццё вы ў шчасці правялі!

**Гаспадар.** Дзякуй вам, мае дарагія, што нашу хату не абмінулі. Давайце ж на развітанне прыгожую песню заспяваем. *(Усе спяваюць песню «Ой, паля».)*

**Усе развітваюцца:**

– Заставайцеся з Богам;
– Бывайце здаровы, жывіце багата;
– Будзьце жывенькі, здаровенькі;
– Здаровы бывайце і нас не забывайце;

– Хадзіце здаровыя!

*Гаспадары дзякуюць. Чуецца стук у дзверы.*

**Гаспадар.** Калі ласка, заходзьце. *(Уваходзіць дзяўчына Восень.)*

**Гаспадыня.** *(Радасна).* Дык гэта ж багіня – Восень! Праходзьце, калі ласка, будзьце як дома.

**Усе разам.** Восень, Восень, у госці просім!

**Восень.** Добры вечар у хату! *(Кланяецца гасцям і гаспадарам.)* Хай вам жывецца заўсёды багата! *(Абсыпае ўсіх зернем, лісцем)*

Прыскакала Восень на залатым канёчку,
Ураджай багаты прывезла гаспадарочкам.
Дастаткам і радасцю людзей адарыла,
Ярак-жоўтым золатам усё наўкол пакрыла.

**Гаспадар.** Дзякуй нашай Восені-багіні. Сядайце адпачніце з далёкай дарогі.

**Восень.** Дзякуй і вам, што прымаеце, можа мае загадкі адгадаеце?

З галінкі збіты ветрам
Ён на зямлю не лёг.
А кружыцца ў паветры,
Як жоўты матылёк. *(Ліст.)*

Стаіць у агародзе ў зялёным халаце,
А добра прыгледзішся – лата на лаце. *(Капуста.)*

Завітала ў хату пані
Ды ў жоўтым сарафане.
Як пачалі распранаць,
Сталі плакаць, праклінаць. *(Цыбуля.)*

У бабулі родны брат
Ласкавейшы быццам,
А да слёз давесці рад
Так, як і сястрыца.
Сам сабе наўме панок,
А прасцей сказаць… *(Часнок.)*

Царэўна ў няволі,
У цёмнай каморы.
А косы – на сонцы,
На вольным прасторы. *(Морква.)*

Славен край наш ёй здаўна.
Трыста розных страў яна.
І зімой, і летнім часам
На яе ты вельмі ласы. *(Бульба.)*

Сядзіць дзед, у многіх плаццях адзет, хто яго распранае, ад жаласці слёзы праліваае. *(Цыбуля.)*

70 адзёжак, ды ўсе без засцёжак. *(Капуста.)*
На градцы – доўгі і зялёны, а ў бочцы – жоўты і салёны. *(Агурок.)*
Ні вакна, ні дзвярэй – поўна хата курэй. *(Гарбуз.)*

**Восень.** Якія вы малайцы. Я бачу, што вы вельмі добра падрыхтаваліся да свята. А колькі ўраджаю сабралі. Люба-дарага глянуць!

***Гульня « Кляновы лісток»***

**Вядучы.** А зараз давайце з вамі трохі пагуляем. Гульня называецца «Кляновы лісток». Для гульні патрэбны 2 чалавека. Ваша задача дуць на лісцік, каб ён не ўпаў на падлогу. Пераможца той, хто дольш пратрымае лісток на паветры.

Як жа з вамі добра і весела. Але мне пара ісці, шмат яшчэ работы мяне чакае.

**Вядучая.** Да сустрэчы, Восень! Да сустрэчы!
А цяпер, каб вы не сумавалі,
Трэба каб у конкурсе сябе паказалі.
Хто з завязанымі вачыма болей клубняў назбірае,
Той смачны пачастунак атрымае.
*(Збіраюць з завязанымі вачыма бульбу).*
А цяпер ні на што не зважайце,
А мой конкурс пачынайце!

**Вядучы.** Ой, якая багатая восень, Усё ў яе ўдалося!
Жыта ў трубу павілося.

Усё святкаванне Багача было святасцю, выказваннем вялікай адказнасці, асобай пашаны да хлеба. А ці ведаеце вы прымаўкі пра хлеб? Я буду пачынаць прымаўку, а вы працягваць.

Шмат снегу ..... шмат хлеба.
Едзеш на дзень – бяры хлеба ...... на тыдзень.
Без хлеба няма ..... абеда.
Хлеб не зяць – паглядзець ..... ды з’ядзяць.

Жывём ..... хлеб жуём.

Калі ёсць хлеб і вада ..... то не бяда.

Хлеб усяму ..... галава.

**Вядучая.** Дарагія госцейкі! Вось і падышло да заканчэння наша свята – свята Багача, новага ўраджаю, цёплага і духмянага хлеба. Вы сёння ўбачылі, як яго адзначалі нашыя продкі ў старажытнасці, як плённа працавалі, як шанавалі хлеб, як умелі спяваць і танцаваць. Старажытнае свята Багача сёння ў нашай краіне адзначаюць, як свята ўборкі ўраджаю. Можа, мне хтосьці падкажа, як яно зараз называецца?

Правільна, гэта Дажынкі. Кожны год адзін з гарадоў Беларусі прымае людзей, якія вырасцілі такі дарагі нам хлеб.

**Вядучы.** Вялікі дзякуй, што вы ўсе сюды прыйшлі. Дай Бог вам долі, мае каласочкі, каб вы ўсё жыццё ў шчасці правялі! А зараз пачастуйцеся дарамі, якія падрыхтавала вам восень!

*Гучыць песня «Бывайце здаровы!».*